# National Press Release (Belarus)

Original Press Release:

# ПРЕСС-РЕЛИЗ

**24 May 2005**

## *Беларускія арнітолагі дзеляцца досведам*

З 14 па 17 чэрвеня 2005 года на базе рэспубліканскага біялагічнага заказніка “Званец”, што размешчаны ў Драгічынскім і Кобрынскім раёнах Брэсцкай вобласці, пройдзе сустрэча Міжнароднай працоўнай групы па захаванні вяртлявай чаротаўкі.
Сустрэча ладзіцца Грамадскай арганізацыяй “Ахова птушак Беларусі” пры падтрымцы сумеснага праекта Праграмы Развіцця ААН у Рэспубліцы Беларусь, Фонда “Дарвінаўская ініцыятыва для знікаючых відаў”, брытанскай прыродаахоўнай арганізацыі “Каралеўскае таварыства абароны птушак”, Фонда Міхаэля Отта па ахове навакольнага асяроддзя (Германія) “Выкананне першачарговых мерапрыемстваў інтэграваных планаў кіравання ключавымі нізіннымі балотамі Палесся з мэтаю захавання біялагічнай разнастайнасці”. Праграма сустрэчы будзе ўключаць знаёмства з працай па захаванні беларускай папуляцыі вяртлявай чаротаўкі, што вядуць спецыялісты Аховы птушак Беларусі. Міжнародныя спецыялісты пабачаць метады вядзення маніторынгу вяртлявай чаротаўкі, вывучэння рацыёну яе птушанят, іншыя заалагічныя і батанічныя даследаванні, што неабходны для лепшага разумення патрабаванняў вяртлявай чаротаўкі і асаблівасцяў яе сувязяў у экасістэме. Таксама, будуць прадэманстраваны мерапрыемствы па аптымізацыі гідралагічнага рэжыму балота Званец, што былі выкананы ў рамках праекту ААН.

Міжнародная працоўная група па захаванні вяртлявай чаротаўкі аб’ядноўвае каля 30 спецыялістаў-арнітолагаў з 10 краінаў Еўропы, сярод якіх ёсць і прадстаўнікі Беларусі. Група працуе пад эгідай сусветнага партнёрства BirdLife International, паўнавартасным партнёрам якога на Беларусі з’яўляецца Грамадская арганізацыя “Ахова птушак Беларусі”.

Менавіта спецыялістам Працоўнай групы належыць “адкрыццё” беларускай папуляцыі вяртлявай чаротаўкі напрыканцы 90-х гадоў, што больш чым удвая павялічыла вядомую колькасць птушак і ўнесла некаторы спакой наконт будучыні гэтага, тады вельмі лакальна распаўсюджанага, віду. Своечасовая знаходка гнездавых папуляцый вяртлявай чаротаўкі на трох нізінных балотах Беларусі дазволіла Ахове птушак Беларусі распрацаваць і выканаць шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на змяншэнне негатыўнага ўплыву дзейнасці чалавека на балотные экасістэмы.

На рахунку Міжнароднай працоўнай групы і 3 экспедыцыі па пошуку вяртляваў чаротаўкі ў Сібір, дзе нізінныя адкрытыя балаты – аптымальны біятоп для “вяртляўкі” – займаюць вялізарныя абшары. Дабірацца да некаторых месцаў там можна было толькі пры дапамозе верталёту. На жаль, гіпотэза аб наяўнасці ў Сібіры моцнай гнездавой групоўкі вяртлявай чаротаўкі не была сцверджана. Падчас гэтых 3 экспедыцыях былі адзначаны ўсяго некалькі спяваючых самцоў, што можа гаварыць аб наяўнасці там некалі вялікай але цяпер занікаючай папуляцыі вяртлявай чаротаўкі.

Адзін з сённяшніх найбольш прыярытэтных накірункаў дзейнасці Працоўнай групы – высвятленне дакладных месцаў зімоўкі вяртлявай чаротаўкі. На жаль, нягледзячы на вялізную працу па захаванні месцаў гнездавання, што вядзецца зараз ва ўсіх краінах гнездавога арэалу віду, дакладнай інфармацыі аб

**Грамадзкая арганізацыя**
**«Ахова птушак Беларусі»**
**ОО "Охрана птиц Беларуси"**
**(АПБ) (рус.)**
**APB-BirdLife Belarus (англ.)**

**а/с 306, 220050 Мінск,**
**тэл.: 263 01 30**
**тэл./факс: + 017 263 06 13,**
**e-mail: apb@tut.by**

месцах зімоўкі віду пакуль што няма. На падставе некалькі дзесяткаў рэгістрацыяў мігруючых чаротавак у Афрыцы есць меркаванні аб тым, што птушка  зімуе ў Заходняй Афрыцы, на поўдзень ад Сахары, на тэрыторыі Сенегалу, Малі, Ганы, Маўрытаніі.

Адсутнасць дакладнай інфармацыі аб месцах  зімоўкі і, адпаведна, немажлівасць іх аховы, на сённяшні дзень з'яўляецца, бадай, найвялікшай патэнцыяльнай пагрозай існавання вяртлявай чаротаўкі. Неспрыяльныя кліматычныя ўмовы або антрапагенная трансфармацыя месцаў зімовак можа па просту знішчыць

Зараз, сумесна з навукоўцамі Каралеўскага таварыства аховы птушак (RSPB), партнёра BirdLife у Вялікабрытаніі, Працоўная група вядзе актыўныя даследаванні з выкарыстаннем аналізу стабільных ізатопаў у пер'і вяртлявых чаротавак каб больш дакладна вызначыць магчымы рэгіён зімоўкі. Як толькі магчымы рэгіён зімоўкі будзе хоць бы трошкі звужаны, спецыялісты Працоўнай групы змогуць правесці экспедыцыю ў Афрыку і наведаць нашых чаротавак у іх зімовых кватэрах.

Актыўная праца і ўдзел лепшых спецыялістаў-арнітолагаў з усёй Еўропы робяць Працоўную групу па захаванні вяртлявай чаротаўкі найбольш аўтарытэтнай інстанцыяй у пытаннях, што тычацца вывучэння і аховы  гэтай рэдкай птушкі. Тым больш прыемнай з'яўляецца цікавасць гэтай аўтарытэтнай арганізацыі да навуковых даследаваняў і ахоўнай працы што праводзіцца Аховай птушак Беларусі ў нашай краіне, і сведчыць, між іншым, і аб іх надзвычайна высокім узроўні і актуальнасці.

А.Минчонак, АПБ

<u>**English summary:**</u>

## *Belarusian Ornithologists Share the Experience*

From 14 to 17 June 2005 in the republican biological reserve "Zvanets" located in Drogichin and Kobrin districts of Brest oblast, a meeting of International Aquatic Warbler Conservation Team will take place.

The meeting will be organized by NGO "APB-BirdLife Belarus' with support of the joint project of the UNDP, Darwin Initiative for the Survival of Species, the RSPB, Michael Otto Foundation for Environmental Protection "Implementing Urgent Conservation Actions in Mesotrophic Fen Mires in Belarus". The schedule of the meeting will include getting acquainted with the work done for conservation of the Belarusian population of Aquatic Warbler, studies of the AW nestlings diet, other zoological and botanical studies necessary for better understanding of the needs of Aquatic Warbler and peculiarities of its connections with the ecosystem.

The International Aquatic Warbler Conservation Team includes about 30 ornithologists from 10 European countries, including Belarus. The team works under the auspices of world partnership "BirdLife International", and "APB-BirdLife Belarus" is its partner in Belarus.

The discovery of the Belarusian population of Aquatic Warbler in the late 90s belongs exactly to the specialists of the Working group. This event revealed that the species numbers were twice larger than had been known before. The timely discovery of the nesting populations of Aquatic Warbler on the three fen mires in Belarus allowed APB-BirdLife Belarus to elaborated and implement a number of activities aimed at reducing negative impact of man's actions on the mire ecosystems.

At present together with the scientists of the Royal Society for the Protection of Birds (RSPB), BirdLife partner in Great Britain, the Working group conducts active studies using the method of stable isotope in AW feathering in order to most distinctly determine the region of AW wintering. As soon as the possible wintering region is at least a bit narrowed the Working group specialists will be able to organize expedition to Africa and visit our aquatic warblers in their winter 'flats'.

Active work and participation of the best ornithologists from the whole Europe make the International Aquatic Warbler Conservation Team the most authoritative source of information on the issues connected with studies and conservation of this rare species. And it is particularly pleasant that interest paid by this authoritative organization to research and conservation work implemented by APB-BirdLife Belarus in our state proves their high level and current importance.

A.Minchonak, APB